# «ВЯСНА Ў ГОРАДЗЕ»

На вечарыну паэзіі і аўтарскай песні «Вясна ў горадзе», што праходзіла ў чытальнай зале навуковай бібліятэкі нашага ўніверсітэта напрыканцы сакавіка, прыйшлі зацікаўленыя, творчыя людзі: студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі ВНУ.

Арыгінальныя музычныя нумары падрыхтавалі ўдзельнікі тэатра-студыі аўтарскай песні: прысутныя маглі паслухаць кампазіцыі на вершы паэтаў Барыса Рыжына і Максіма Жыгаліна. А Леанід Аляксандраў прадставіў песню «Ниоткуда с любовью» (на словы Іосіфа Бродскага).

Студэнткі другога курса філалагічнага факультэта Анастасія Катушонак і Вікторыя Лукашэвіч, удзельніцы літаратурнай гасцёўні, расказалі пра сябе, сваю творчасць і правялі «літаратурную дуэль».

Кіраўнік гасцёўні, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Саюза пісьменнікаў Расіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры нашай ВНУ Алена Крыклівец і старшыня Віцебскага аддзялення Беларускага літаратурнага саюза «Полоцкая ветвь», паэт і казачнік Алег Сяшко прачыталі свае вершы пра Віцебск, гарадскія будынкі, прыроду, людзей... Безумоўна, майстры слова па-творчаму аднесліся да выступлення: амаль да кожнага свайго твора яны падабралі маляўнічыя фотаздымкі ці відэа, якія былі прадэманстраваны на слайдах. Дзякуючы гэтаму мы змаглі не проста паслухаць вершы, але і пабачыць, як выглядае тое ці іншае месца.

Завяршылася мерапрыемства песняй у выкананні Андрэя Касалапава і Цімафея Чысцякова. Загадчык кафедры літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Вольга Віктараўна Лапацінская падзякавала ўсім, хто знайшоў час прыйсці на вечарыну паэзіі і аўтарскай песні, пажадала шчасця, здароўя і вясновага настрою.



**Аліна КАРПЫЗІНА,**
**студэнтка**
**1-га курса ФлФ.**
**Фота А. ЛАЗЕБНАЙ.**